**Ю. Талмачова**

# М. В. ДОЎНАР-ЗАПОЛЬСКІ АБ КРАЯЗНАЎЧЫМ РУХУ Ў БЕЛАРУСІ

Беларусь – незалежная дзяржава, якая мае ўласную багатую гісторыю, створаную шматлікімі пакаленнямі людзей, якія жылі на нашай зямлі. Мы павінны яе ведаць і паважаць, памятаць і разумець, ганарыцца і ўслаўляць. Наша гісторыя – гэта невычэрпная крыніца для выхавання патрыятызму.

Маёй малой радзіме – Рэчыцкаму краю – у гэтым сэнсе пашанцавала: ён мае непаўторнае аблічча, сваё мінулае і сваіх слаўных землякоў. Адзін з іх – выдатны беларускі гісторык Мітрафан Віктаравіч Доўнар-Запольскі (1867 – 1934). Яго навуковая спадчына вялікая і шматгранная, таму мэта дадзенага даследавання арыентавана на распрацоўку яе канкрэтнага аспекту: ацаніць ролю М. В. Доўнар-Запольскага ў развіцці краязнаўства ў Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

Доўнар-Запольскі зацікавіўся вывучэннем Беларусі з краязнаўчага пункту гледжання яшчэ ў часы навучання ў гімназіі і Кіеўскім універсітэце. Неабходна адзначыць, што ў тую эпоху краязнаўства паступова набывала папулярнасць сярод шырокіх колаў насельніцтва, перастаўшы быць справай толькі асобных даследчыкаў-энтузіястаў. Быў арганізаваны шэраг навуковых экспедыцый з мэтай этнаграфічнага даследавання Беларусі. У выніку іх было сабрана шмат матэрыялаў, якія пераканаўча сведчылі аб самабытным характары побыту мясцовага насельніцтва.

У цыкле артыкулаў, надрукаваных у газеце "Мінскі лісток" пад агульнай назвай "Белорусское прошлое", М. Доўнар-Запольскі пераканаўча даказваў самастойнасць беларускага этнасу. На старонках той жа газеты ён казаў пра неабходнасць шырокага ўдзелу мясцовай інтэлігенцыі ў вывучэнні роднага краю: "Дзеячы мясцовай навукі павінны знайсціся ў самім краі. Не з Казані ж або Адэсы чакаць навукоўцаў для археалагічных раскопак ці для заняткаў у архівах!". На яго думку, неабходна было заснаваць такую ўстанову, якая "...магла стаць на чале навуковай распрацоўкі краю". У якасці альтэрнатыўных варыянтаў ён прапаноўваў стварыць або самастойнае мясцовае навуковае таварыства, або філію якога-небудзь сталічнага. Беларускі навуковец асабліва падкрэсліваў, што такое таварыства павінна быць не намінальным, а сапраўдным, з уласным навуковым органам.

М. Доўнар-Запольскі распрацаваў праграмы для збірання этнаграфічных матэрыялаў і разаслаў іх у рукапісах народным настаўнікам Мінскай губерні. У 1893 г. выдаў праграму-заклік «Значэнне этнаграфічнага вывучэння Гродзенскай губерні».

Такім чынам, навуковая дзейнасць М. В. Доўнар-Запольскага значна паўплывала на развіццё краязнаўчых даследаванняў у Беларусі. З дапамогай яго праграм была сабрана значная колькасць этнаграфічных і фальклорных матэрыялаў. Ён даказаў, што беларусы маюць уласную багатую гісторыю і культуру, а таксама адрозніваюцца ад суседніх народаў спецыфічнымі этнічнымі асаблівасцямі.